| Pieczątka szkoły | Kod ucznia | Liczba punktów |
| --- | --- | --- |
| | | |

**WOJEWÓDZKI KONKURS JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO**

**DLA UCZNIÓW SZKÓŁ PODSTAWOWYCH**

**W ROKU SZKOLNYM 2016/2017**

***STOPIEŃ REJONOWY – 17.01.2017 r.***

1. Test konkursowy zawiera 11 zadań. Są to zadania zamknięte i otwarte. Na ich rozwiązanie masz 90 minut. Sprawdź, czy test jest kompletny.
2. Zanim udzielisz odpowiedzi, uważnie przeczytaj treść zadania.
3. Wszystkie odpowiedzi czytelnie i wyraźnie wpisuj w wyznaczonych miejscach.
4. Test wypełniaj długopisem, nie używaj korektora, ołówka ani gumki. Nie komunikuj się z innymi uczestnikami konkursu.
5. Przy rozwiązywaniu zadań zamkniętych wyboru wielokrotnego wybierz jedną, prawidłową odpowiedź i zaznacz ją krzyżykiem, np.:

   ~~A~~ B C D

   Jeżeli się pomylisz i zechcesz wybrać inną odpowiedź, to złe zaznaczenie otocz kółkiem (~~B~~), po czym skreśl właściwą literę, np.:

   A (~~B~~) ~~C~~ D

6. Sprawdź wszystkie odpowiedzi przed oddaniem testu.
7. Nie podpisuj testu, zostanie on zakodowany.
8. Brudnopis, dołączony do testu, nie podlega ocenie.

**Zadanie 1.** *(p. 4)*

Прачытай уважна ўрывак апавядання Артура Вольскага "Хлеб - усяму галава" і адкажы на пытанне пры дапамозе двух сказаў: *Якія чалавечыя паводзіны не падабаюцца аўтару і чаму?*

"Даўно гэта было. Галаднавата жылі мы тады. Хлеб - па картках. Дый тое не ўволю, а каму колькі на дзень пакладзена. І толькі чорны. Іншых прадуктаў таксама не хапала.

З таго часу не магу спакойна глядзець, як некаторыя людзі марна хлеб праводзяць. Набяруць у краме больш, чым трэба, а потым выкідаюць. Або, як у школьнай сталоўцы бачыў неяк, дзеці рэшткамі хлеба адзін у аднаго шпурлялі.

Так і карцела падысці і сказаць:

- А ці ведаеш ты, якою працаю хлеб здабываецца?..."

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

**Zadanie 2.** *(p. 5)*

Перакладзі з беларускай мовы на польскую мову сказы з тэксту Вацлава Ластоўскага "Што трэба ведаць кожнаму беларусу?".

„Беларуская мова

Чаму мы гаворым беларускай мовай?

Бо яна наша родная, а кожны чалавек любіць сваю родную мову.

Якая наша мова?

Наша мова адна з найчысцейшых у славянскай сям'і моў”.

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

**Zadanie 3.** *(p. 6)*

Адкажы на пытанні выкарыстоўваючы верш Эдзі Агняцвет.

"Першае слова"

Першы голас, які я пачула на свеце,
Быў голасам маці.
Калыханку пад месяцам
і на дасвецці
Спявала мне маці.

Гэта першая песня
І першае слова
Зямлі маёй весняй
Гэта - ціхая ласка і міру ахова.
Дзякуй, маці, за песню.

Запаветныя, родныя фарбы і гукі -
Усё застаецца.
Дзякуй, мама, за рукі,
Бяссоныя рукі,
За адданае сэрца!

Рукі цёплай пяшчоты,
Турботы і працы -
Ад ляноты лячылі.
Ані якай работы ў жыцці не цурацца
І мяне навучылі.

Не пакрыўджу цябе,
З тваіх сцежак не збочу,
Засланю ад нягоды.
Я хачу, каб свяціліся радасцю вочы
І жыла ты заўсёды.

1. За што ўдзячнае лірычнае "я"(аўтар) маці? Назаві тры рэчы.

..............................................................................................................................................

..............................................................................................................................................

2. Якое абяцанне дае лірычнае "я" (аўтар) маці?

..............................................................................................................................................

..............................................................................................................................................

3. Якая, паводле цябе, асноўная думка верша?

..............................................................................................................................................

..............................................................................................................................................

**Zadanie 4.** *(p. 10)*

На аснове апавадання Змітрака Бядулі "Музыка" раскажы сваімі словамі ў пяці сказах пра ўплыў ігры Васількі на навакольны свет - прыроду.

Бывала, як зайграе Васілька вясёлую песеньку, дык неба весялілася, сонца смяялася, дрэўцыківаліся ў такт. Зляталіся розныя птушкі, збягаліся розныя звяры, спаўзаліся розныя гадзіны слухаць ігру пастушка... Усім істотам было весела і добра ад яго песняў.
А калі пастушок іграў жаласлівую песню дык сумна рабілася на полі. Краскі слязамі расістымі пакрываліся. Дрэўцы і кусты нямелі, а высока над полем хмаркі затулялі яснае неба. Усе жывыя істоты апускалі галовы і глыбока задумваліся. Але і смутак - жаль ад трэляў жалейкі быў усім прыемны, як свежы ранішні туман. (...) Усіх Васілька зачароўваў.

..................................................................................................................................
..................................................................................................................................
..................................................................................................................................
..................................................................................................................................
..................................................................................................................................
..................................................................................................................................

**Zadanie 5.** *(p. 10)*

У пяці сказах раскажы пра калядную вячэру паводле тэксту "Куцця" выкарыстоўваючы ніжэй пададзены план:

1) Падрыхтоўка да свята ў сям'і Міхала.
2) Заняткі паасобных членаў сям'і перад каляднай вячэрай.
3) Стравы на святочным стале.
4) Калядныя вераванні.

..................................................................................................................................
..................................................................................................................................
..................................................................................................................................
..................................................................................................................................
..................................................................................................................................
..................................................................................................................................

**Zadanie 6.** *(p. 5)*

Адзнач правільны адказ на падставе тэксту Сяргея Тарасава "Адкуль пайшлі беларусы".

1) Беларусы пайшлі ад:
а) Рагвалода
б) Белаполя
в) Усяслава Чарадзея

2) Да плямёнаў, якія далі пачатак беларускаму народу не належаць:

а) Крывічы

б) Дрыгавічы

в) Паляне

3) З часам беларускія княствы аб'ядналіся ў адну вялікую дзяржаву:

а) Вялікае княства Літоўскае

б) Рэч Паспалітую

в) Рэспубліку Беларусь

4) Сталіцай новай дзяржавы стаў:

а) Полацк

б) Наваградак

в) Мінск

5) Заходнееўрапейскія падарожнікі беларускія землі пачалі называць Белай Руссю. Частка "белы" не паходзіць ад:

а) колеру льнянай вопраткі і русых валасоў

б) бел-чырвона-белага сцяга

в) слова вольная "ад мангола-татарскай няволі"

**Zadanie 7.** *(p. 10)*

Устаў літару "ў" або "у".

1. Я думаю: які ц...до...ны свет і якая прыгожая наша краіна. 2. Знаёмцеся з помнікамі культ...ры, архітэкт...ры. 3. У вырай сабраліся гусі і жора... азва...ся пад небам. 4. Я змалк... зведа..., як гамоняць рэкі, як ціха плачуць вербы над вадой. 5. Скарынава "Біблія" была крыніцай веда..., яе чыталі на Беларусі і ...краіне.

**Zadanie 8.** *(p. 8)*

Пастаў дзеясловы, што ў дужках, у цяперашнім часе.

Аўтобус (ісці) ......................... па выбітай грунтовай дарозе. За яго вокнамі зямля то раптам (падымацца) ........................., то (падаць) ........................... пад колы. (Бегчы) ........................... хвіліна за хвілінаю. Аўтобус (выбірацца) ....................... на роўную дарогу. Справа і злева (адкрывацца) ........................ нечаканыя краявіды. (Набліжацца)................................... вёска, што маячыла ўвесь час на далягладзе. Аўтобус (спыняцца) ................................. на вялікім пляцы ў цэнтры сяла.

**Zadanie 9.** *(p. 6)*

Запішы дзеяслоў у цяперашнім або прошлым часе.

ідзе - ....................................

..........................- працаваў

........................ - чытаў

гаворыць - ............................

....................... – пісаў

думае - ................................

**Zadanie 10.** *(p. 3)*

Акрэслі віды казак.

1. Жыў дзед з бабаю. І было ў іх тры сыны. Бедна жылі, увесь час з хлеба на квас перабіваліся. Памерла баба, а за ёю прыйшла чарга і на дзеда. Паклікаў бацька перад смерцю сыноў і кажа ім:
- Гаспадаркі я вам не нажыў, падзялю што маю.
І даў старэйшаму сыну - жоўтага ката, сярэдняму - жорны, а малодшаму, Івану, - вязку лык на лапці. ("Як Іван чарцей перахітрыў")
Гэта казка (якая?) .........................................................................

2. У даўніну людзі сябравалі з вужамі. Давалі ім прытулак, кармілі хлебам і малаком. Нікога не кусаў, поўзаў па хаце, як сапраўдны гаспадар. Прысядуць людзі папалуднаваць - і ён тут як тут, цягнецца пыскаю да ежы... Даўней людзі верылі: калі з імі побач вуж, - будзе шчасце і дастатак у хаце. А калі ён паміраў, то вельмі смуткавалі і рабілі з вужовага тлушчу свечку на ліхі дзень. Надыдзе бяда - селянін запальваў свечку... Тады ўсе вужы спяшаліся на дапамогу добрым людзям. ("Вужовы кароль")
Гэта казка (якая?)..........................................................................................

3. Пабегла курачка да каровы:
- Карова, карова, дай масла!
- На што табе масла?
- Пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.
- Добра, - кажа карова, - дам табе масла. Але схадзі спярша да касцоў, папрасі сена. ("Як курачка пеўніка ратавала")
Гэта казка (якая?) ..........................................................................................

**Zadanie11.** *(p. 8)*
Дапасуй прыметнікі да назоўнікаў.

(Халодны, асенні) ....................., .......................... раніца. На дарозе ляжаць (чорны, мокры) ......................, ............................. лісты. З поўначы дзьме (марозная) ........................... вецер. Людзі апранаюцца ў (цёплая) .......................... вопратку. Я не люблю такой (сумная) ........................... пары года. Няхай заўсёды жыве (прыгожы) ............................. вясна.

**BRUDNOPIS (nie jest oceniany)**